# ЁН ПАШЫРАЎ ГАРЫЗОНТЫ ЖАНРАЎ. Б. В. СТРАЛЬЦОЎ – ЛІТАРАТУРНЫ СУПРАЦОЎНІК АБЛАСНОЙ ГАЗЕТЫ «САВЕЦКАЯ РАДЗІМА» (Бабруйск, 1950–1953 гг.)

***П. Л. Дарашчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*pdoroshhyonok@mail.ru*

У публікацыі даследуюцца газетныя матэрыялы вядомага публіцыста і вучонага Б. В. Стральцова ў перыяд яго работы ў бабруйскай абласной газеце «Савецкая Радзіма» (1950–1953 гг.). Пры падрыхтоўцы публікацый на сельскагаспадарчую тэматыку аўтар на практыцы значна пашырыў жанравую палітру мясцовым друку, што пасля стала эмпірычнай базай для далейшых навуковых даследаванняў пры распрацоўцы тэорыі жанраў савецкай публіцыстыкі.

***Ключавыя словы:*** абласная газета; газетныя жанры; сельскагаспадарчая тэматыка; новыя формы публіцыстычных матэрыялаў.

# HE EXPANDED THE HORIZONS OF THE GENRE. B. V. STRELTSOV – A LITERARY EMPLOYEE OF THE REGIONAL NEWSPAPER «SOVETSKAYA RODINA» (Bobruisk, 1950–1953)

***P. L. Darashczonak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Correspondind author: P. L. Darashczonak (pdoroshhyonok@mail.ru)*

The publication examines newspaper materials of a famous publicist and scientist B. V. Streltsov during his work in the Bobruisk regional newspaper «Sovetskaya Rodina» (1950–1953). When preparing publications on agricultural topics, the author in practice significantly expanded the genre palette of the local press, which later became an empirical basis for further research in the development of the genre theory of Soviet journalism.

***Key words***: regional newspaper; newspaper genres; the agricultural theme; new form of journalistic materials.

У багатай на творчыя праекты і падзеі біяграфіі прафесара Барыса Васільевіча Стральцова, змешчанай ў бібліяграфічным слоўніку «Беларускія пісьменнікі», вельмі сціплае месца займаюць звесткі аб працы будучага вучонага і журналіста ў бабруйскай абласной газеце «Савецкая Радзіма». Разам з тым гэты перыяд з'яўляецца вызначальным у яго лёсе. З газетных публіцыкацый, багатых па сваёй жанравай палітры, пачынаўся творчы ўзлёт маладога літсупрацоўніка да вышынь журналісцкага майстэрства, лагічным працягам якога з'яўлялася праца ў рэдакцыях рэспубліканскіх газет, выкладчыцкая і навуковая дзейнасць на факультэце журналістыкі БДУ.

Вучобу Барыса Стральцова ў 1941 г. перарвала Вялікая Айчынная вайна. Ён паспеў скончыць 8 класаў Чавускай сярэдняй школы, што на Магілёўшчыне, а праграму дзявятага класа асвоіў ужо пасля вайны, падчас службы ў Савецкай Арміі (1950 г.). Вучобу працягваў у адной з вячэрніх школ г. Бабруйска, дзе пасля заканчэння 10 класаў атрымаў атэстат аб сярэдняй адукацыі (1951 г.). У 1951–1956 гг. быў студэнтам завочнага аддзялення філалагічнага факультэта БДУ.

У Бабруйскай вобласці, створанай ў 1944 г., яшчэ ў 20-я гг. ХХ ст. існавала мясцовая прэса. Адной з лепшых газет таго часу быў бабруйскі «Камуніст» – спачатку павятовае, а потым акруговае выданне. У пасляваенны час – з 22 кастрычніка 1944 г. да 12 студзеня 1954 г. – у абласным цэнтры выходзіла газета «Савецкая Радзіма», дзе на працягу амаль чатырох гадоў працаваў Б. Стральцоў.

Свой першы рэпартаж пад загалоўкам «Агнявы рубеж» Б. Стральцоў змясціў на старонках газеты «Советская Армия» падчас службы ў групе савецкіх войск у Германіі, публікацыя не выяўлена. Нарыс «Вясна ў Рассвеце», надрукаваны ў газеце «Савецкая Радзіма» (Бабруйск, 1951 г.) лічыўся дагэтуль яго першай публікацыяй у беларускім рэгіянальным друку. Але яшчэ за год да гэтага – у 1950 г. – былы ваеннаслужачы ўладкаваўся на працу ў абласную бабруйскую газету, прычым яшчэ не маючы дакумента аб сярэдняй адукацыі. 26 верасня таго ж года ў газеце «Савецкая Радзіма» з'явілася яго невялікая карэспандэнцыя «Камсамольска-маладзёжная брыгада фармоўшчыкаў» аб працоўных дасягненнях маладзёжнай брыгады, створанай у бабруйскай арцелі «Чырвоны металіст». Да канца 1950 г. на старонках абласной газеты выйшла яшчэ некалькі публікацый Б. Стральцова. Карэспандэнт «Савецкай Радзімы» аналізаваў становішча спраў пры правядзенні палявых работ у карэспандэнцыі «Зябліва – пад увесь яравы клін: аб прыхільніках веснавога ворыва» (Сав. Радзіма, 1950, 18 ліст.),

крытыкаваў марудныя тэмпы здачы ільнопрадукцыі дзяржаве ў матэрыяле «Забяспечыць выкананне плана ільнанарыхтовак» (Сав. Радзіма, 1950, 7 снежня), пісаў пра нездавальняючую арганізацыю працы ў Бабруйскіх міжраённых майстэрнях капітальнага рамонту ў публікацыі «Неарганізаванасць у важнай справе» (Сав. Радзіма, 1950, 26 снежня).

Публікацыі Б. Стральцова, якія друкаваліся на старонках газеты ў 1951–1953 гг., сведчаць аб вялікім творчым патэнцыяле маладога журналіста, які спецыялізаваўся на сельскагаспадарчай тэматыцы. Нататкі, карэспандэнцыі, рэпартажы, замалёўкі, справаздачы – вось далёка не поўны пералік жанраў, якія хутка асвоіў здольны літаратурны супрацоўнік абласнога выдання. З зайздросным пастаянствам у газеце з’яўляліся не толькі невялікія аператыўныя публікацыі, але і салідныя «падвалы» за подпісам Барыса Васільевіча. Супрацоўнік рэдакцыі спрабаваў свае сілы нават у такім рэдкім для таго часу жанры, як газетны нарыс.

Публікацыя «Героі» з Любанскага раёна аб выдатных працоўных дасягненнях брыгадзіраў калгаса «Чырвоная змена» А. Шаплыка і П. Галай, брыгадзіра трактарнай брыгады Любанскай МТС Р. Сушчэні была аператыўна падрыхтавана Б. Стральцовым пасля прыняцця Указа Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні ім ганаровага звання Героя Сацыялістычнай Працы (Сав. Радзіма, 1951, 8 ліп.). З асаблівай цеплынёй быў напісаны рэпартаж «Залаты паток» (Сав. Радзіма, 1951, 31 ліп.) пра ўборку ўраджаю ў калгасе імя Сталіна Глускага раёна, падпісаны двума прозвішчамі: Б. Стральцоў і Р. Булацкі. Матэрыял упрыгожваў фотаздымак Ю. Лыскова, зроблены на калгасным нарыхтоўчым пункце ў разгар жніва. Будучы дэкан і прафесар, а тады яшчэ выпускнік журфака Рыгор Васільевіч Булацкі прыехаў для праходжання практыкі на родную Бабруйшчыну ў рэдакцыю «Савецкай Радзімы», там жа адбылося і знаёмства двух маладых журналістаў, якое хутка перарасло ў шматгадовае сяброўства.

Спрабаваў свае сілы Б. Стральцоў і ў новым для сябе жанры – праблемным артыкуле, падрыхтаваным пасля наведвання 2-й абласной сельскагаспадарчай выставы. Разам з журналістам Н. Валатковічам яны апублікавалі артыкул «У аддзеле жывёлагадоўлі» (Сав. Радзіма, 1951, 14 ліст.), у якім былі выкарыстаны і элементы рэпартажу. У выніку атрымаўся вялікі аналітычны твор аб працоўных дасягненнях спецыялістаў жывёлагадоўлі, работнікаў калгасных і саўгасных ферм з выкарыстаннем шматлікіх статыстычных даных як даваеннага 1940 года, так і паказчыкаў шасці пасляваенных гадоў.

З-пад пяра Б. Стральцова выйшаў матэрыял «Упарадкавацелі» (Сав. Радзіма, 1951, 8 снежня), якім, па сутнасці, у вобласці быў пакладзены пачатак новай ініцыятыве ЦК КПБ(б)Б, накіраванай на больш рацыянальнае выкарыстанне грамадскіх зямель. На прыкладзе працы работнікаў калгаса імя Варашылава Старадарожскага раёна аўтар паказаў, якія магчымасці адкрываюцца перад працаўнікамі вёскі пасля работ па ачышчэнні палеткаў ад зараснік хмызняку, камення, металічнага лому, які заставаўся на палях пасля вайны. Рэалізацыя планаў па ўпарадкаванні арцельных зямель нават у бліжэйшай перспектыве давала варашылаўцам магчымасць атрымаць дадаткова 1500 цэнтнераў збожжа, 100 цэнтнераў тэхнічных культур, 500 цэнтнераў бульбы, дзясяткі цэнтнераў іншай сельскагаспадарчай прадукцыі.

Тагачасныя жанравыя рамкі, відаць, здаваліся цеснымі маладому журналісту, які настойліва шукаў новыя формы падачы матэрыялу на старонках абласной газеты. Вобразныя рэпарцёрскія, нават мастацкія прыёмы падачы матэрыялу прысутнічаюць у большасці публікацый Б. Стральцова. «Залатое мора збажыны. Пад подыхамі цёплага ветру ледзь калышуцца цяжкія, налітыя буйным зернем каласы жыта, ячменю. Даспявае яравая пшаніца», – такой вобразнай карцінкай пачынаецца рэпартаж Б. Стральцова «Натхнёная праца» з адной з гаспадарак Глускага раёна (Сав. Радзіма, 1952, 3 жн.). А вось якімі словамі заканчваецца матэрыял «Баявое садружаства» аб працаўніках Капыльскай МТС: «Вечарамі, калі апошнія промні заходзячага сонца залацяць верхавіны дрэў, калгаснікі звяртаюцца з палёў па дамах. У цёплым празрыстым паветры льецца песня аб заможным калгасным жыцці...» (Сав. Радзіма, 1952, 17 мая). Не будзем забывацца, што гэтыя радкі напісаны яшчэ ў сталінскія часы, тады падобная рыторыка была амаль абавязковым атрыбутам газетных матэрыялаў.

Стральцоўскія партрэтныя замалёўкі часта друкаваліся пад рубрыкай «Людзі сацыялістычнай вёскі»: «Дырэктар перадавой МТС» (Сав. Радзіма, 1952, 19 лют.), «Камуніст Павел Юневіч» (Сав. Радзіма, 1952, 26 крас.); «Васіль Лобан і яго брыгада» (Сав. Радзіма, 1952. 21 мая); «Загадчык свінагадоўчай фермы» (Сав. Радзіма, 1953, 30 мая) і інш. Але з’яўляліся на старонках газеты і ўласныя творчыя распрацоўкі таленавітага журналіста. Адной з такіх навацый былі аўтарскія «Пісьмы з Слуцкага раёна» – «1. Камбайнеры» (Сав. Радзіма, 1952, 12 жн.), «2. Па дарогах Случчыны» (Сав. Радзіма, 1952, 16 жн.), «3. Багаты ўраджай» (Сав. Радзіма, 1952, 31 жн.). У выніку творчага рэйду спецкара абласной газеты чытачы блізка пазнаёміліся з працаўнікамі вёскі падчас самага адказнага этапу барацьбы

за хлеб. Геаграфія матэрыялаў гэтага цыкла аказалася на дзіва шырокай. Карэспандэнт сустракаўся з многімі камбайнерамі гаспадарак Случчыны, шафёрамі грузавых аўтамашын, якія адвозілі збожжа з палявых брыгад, аграномамі, брыгадзірамі, хлебаробамі раёна, якія дабіліся высокіх паказчыкаў пры ўборцы ўраджаю.

На старонках «Савецкай Радзімы» змешчана шмат крытычных матэрыялаў Б. Стральцова. Яны таксама напісаны жыва, пераканаўча. Нярэдка ў матэрыялах прысутнічаюць элементы замалёўкі, рэпартажа. У адпаведнасці з задачамі гэтых публікацый падбіраўся і тон загалоўкаў: «Без кантролю і дапамогі» (Сав. Радзіма, 1953, 20 лют.), «Неапраўданы спакой» (Сав. Радзіма, 1953, 3 крас.), «Абавязацельствы трэба выконваць» (Сав. Радзіма, 1953, 14 крас.) і інш. А калі крытычнага напалу, на думку журналіста, не хапала, у ход ішоў такі жанр, як фельетон. Пад рубрыкай «Фельетон» у газеце з'явілася публікацыя «Бюракраты» (Сав. Радзіма, 1953, 14 чэрв.). Пад агонь знішчальнай крытыкі трапілі чыноўнікі Кіраўскага раённага аддзела сацыяльнага забеспячэння, што, па сутнасці, здзекаваліся з інваліда працы І. Дужынскай, якая хадайнічала аб назначэнні пенсіі. І толькі вострае выступленне газеты змагло спыніць «блуканні па пакутах» 60-гадовай пенсіянеркі.

Творчыя дасягненні Б. Стральцова на старонках газеты «Савецкая Радзіма» не засталіся без увагі арганізатараў СМІ. У савецкі час лепшым супрацоўнікам мясцовых выданняў, якія атрымлівалі там грунтоўную загартоўку, быў адкрыты прамы шлях у рэспубліканскія выданні. Таленавітага журналіста, які на практыцы, а пазней у навуковых даследаваннях распрацоўваў тэорыю жанраў айчыннай публіцыстыкі, у 1953 г. запрасілі на працу ў «Чырвоную змену», а ў 1958–1969 гг. ён працаваў спачатку літработнікам, а потым загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва рэдакцыі газеты «Звязда».

## РЭГІЯНАЛЬНАЯ ПРЭСА БЕЛАРУСІ ЯК АБ'ЕКТ НАВУКОВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

***Т. М. Дасаева***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Dasaeva@bsu.by*

Сістэматызуюцца навуковыя даследаванні выкладчыкаў факультэта журналістыкі БДУ, прысвечаныя рэгіянальнай прэсе Беларусі. Вызнача-